Перазовы

Ванда БАРОЎКА,
доктар філалагічных навук

# "ЖУРАЎЛІНЫ КРЫК" ВАСІЛЯ БЫКАВА Ў КАНТЭКСЦЕ ТВОРАЎ "ПЯДЗЯ ЗЯМЛІ" РЫГОРА БАКЛАНАВА І "АПОШНІЯ ЗАЛПЫ" ЮРЫЯ БОНДАРАВА

Падобна да таго, як у 1929 г. выйшлі раманы пра ўдзельнікаў Першай сусветнай вайны "Смерць героя" Рычарда Олдынгтана, "На заходнім фронце без перамен" Эрыха Марыі Рэмарка і "Бывай, зброя!" Эрнеста Хэмінгуэя, у 1959 г. з'явіліся аповесці пра Вялікую Айчынную вайну "Пядзя зямлі" Рыгора Бакланава, "Апошнія залпы" Юрыя Бондарава і "Жураўліны крык" Васіля Быкава. Аўтары іх – былыя франтавікі-артылерысты, блізкія адзін да аднаго ваенным вопытам і часам нараджэння: Ю. Бондараў і В. Быкаў нарадзіліся ў 1924 г., Р. Бакланаў – у 1923-м. "Жураўліны крык" стаў дэбютнай аповесцю Васіля Быкава, Рыгор Бакланаў і Юрый Бондараў ужо мелі надрукаваныя творы. На пачатку літаратурнага шляху В. Быкаў адзначаў, што яго творчаму станаўленню дапамагала знаёмства не толькі з кнігамі, дзе паказваліся ваенныя дзеянні, кшталту "Разгром" А. Фадзеева, "Ціхі Дон" М. Шолахава, "У акопах Сталінграда" В. Някрасава, але і з напісаным яго равеснікамі Р. Бакланавым і Ю. Бондаравым, якія з новага боку паказалі ваенную рэчаіснасць.

У артыкуле "Жывыя – памяці мёртвых" (1962) В. Быкаў сцвердзіў абавязак пісьменнікаў праўдзіва расказаць пра нядаўняе мінулае, бо ў савецкай літаратуры 1940–1950-х гг. было напісана пра вайну многа, але не так "*ужо многа – добра і праўдзіва, болей – пасрэдна, і, вядома, нямала – дрэнна*" [1, с. 133]. "*Праўда пра вайну і подзвіг народа была выказана далёка не ўся, далёка не поўнасцю*" [1, с. 134] па аб'ектыўных і суб'ектыўных прычынах: спачатку пісьменнікі ішлі па гарачых слядах падзей і не мелі часу для іх асэнсавання, многія тэксты "*стваралiся па метаду кабінетнага сачыніцельства, без дастатковых ведаў і разумення гісторыі і прыроды вайны, на аснове літаратурных (чытай: газетных) крыніц, таропкіх гутарак з удзельнікамі партызанскага руху, той або іншай бітвы і г. д.*" [1, с. 134]; нямала кніг выдалі журналісты, якія з прычыны іх абмежаванага ўдзелу ў баявых дзеяннях не мелі неабходных ведаў для ўвасаблення ваеннай тэмы. Аповесць "На поўдзень ад галоўнага ўдару" (1958) Р. Бакланава звярнула на сябе ўвагу паказам непадфарбаванай ваеннай рэчаіснасці, успрымалася не толькі як мастацкі твор, але і як "*дакумент, мноствам відавочных і ледзьве ўлоўных прыкмет прывязаны да канкрэтнага перыяду вайны, пэўнага месца баёў*" [1, с. 244]. В. Быкаў аднойчы перафразаваў вядомае выказванне пра нараджэнне "натуральнай школы" з гогалеўскага "Шыняля", калі зазначыў, што сам ён з ліку тых пісьменнікаў, што выйшлі з "Батальёнаў..." Ю. Бондарава, дзе цесна перапляталася праблематыка канкрэтнагістарычная і "вечная". Аповесці "На поўдзень ад галоўнага ўдару", "Батальёны просяць агню" (1957) вызначаліся дакладнасцю пададзеных вайсковых дэталей, пераканаўчасцю паказу перажыванняў афіцэраў і салдат той вайны, якую ведалі франтавікі. Літаратурная ж крытыка абвінавачвала Р. Бакланава і Ю. Бондарава ў вузкасці іх "акопнай праўды", прыземленасці персанажаў, хоць менавіта гэтая прыземленасць індывідуалізавала вобразы салдат і афіцэраў, "*напоўніла іх плоццю і пачуццямі, не выдуманымі, а рэальнымі*" [1, с. 136].

Кожная з ваенных аповесцей, што выйшлі ў 1959 г., асаблівая канцэптуальным узроўнем і мастацкімі дэталямі, палемічная ў адносінах да тагачаснага афіцыйнага літаратурнага канона, пераважна ўгрунтаванага на схематызме сюжэтных сітуацый і характараў, узнёслай апісальнасці, павярхоўным дыдактызме. У "Пядзі зямлі" і "Апошніх залпах" размова ішла пра заключны этап Вялікай Айчыннай вайны. У "Пядзі зямлі" адзін з плацдармаў усяго на паўтара кіламетра фронту ўдоўжкі і на кіламетр ушыркі на Днястры стрымлівае націск фашыстаў падчас наступальнай аперацыі Чырвонай арміі – месца мужнага процістаяння ворагам, асяродак сапраўднага франтавога таварыства. Галоўны герой лейтэнант Матавілаў, ад імя якога вядзецца аповед, і яго баявыя таварышы разумеюць важнасць задачы і годна трымаюць абарону. Байцоў падтрымлівае вера ў блізкасць перамогі. Яны спадзяюцца, што лёс іх складзецца больш шчаслівы, чым лёс разгромленага фашыстамі суседняга плацдарма. Аповесць напоўнена лірычнымі ўспамінамі галоўнага героя пра мірныя часы, пра маці, першае каханне, роздумам пра лёсы людзей на вайне і пасля яе. Матавілаў – рамантык, максімаліст. Маладому афіцэру духоўна блізкія байцы з перадавой, а не штабісты кшталту начальніка арт-

забеспячэння палка капітана Клепікава, які звык праводзіць бессэнсоўныя інспекцыі. Матавілаў ненавідзіць палахліўцаў і прыстасаванцаў, паважае смелых людзей, здольных дапамагчы ў цяжкую хвіліну. Вайна стала для лейтэнанта школай жыцця, месцам развітання з ілюзіямі мірнага часу. Ён пераканаваны, што на фронце змаганне ідзе не толькі з фашыстамі, але і дзеля знішчэння подласці, якой не месца ў чалавечым жыцці.

“Апошнія залпы” – лаканічная мастацкая хроніка стрымлівання цягам паўтара сутак невялікай групай савецкіх салдат пераўзыходных сіл праціўніка на мяжы Польшчы і Чэхаславакіі, твор пра няпростыя ўзаемадачыненні паміж камандзірамі і падначаленымі, пра драматычнае франтавое каханне, пра нечаканыя павароты лёсу на вайне. Асноўная ўвага пісьменніка аддадзена капітану Дзмітрыю Новікаву, за плячамі якога школа ды першы курс адной з ВНУ. Маладому, спрактыкаванаму і назіральнаму камандзіру важна не толькі выканаць баявое заданне, але і захаваць жыцці падначаленых, асабліва напярэдадні перамогі. У характары Новікава спалучаюцца дзейснасць і рэфлексійнасць, яго хвалююць пытанні дабра і зла ўвогуле і ў надзвычайных умовах. Вайна прывучыла яго ацэньваць людзей па іх справах, спарадзіла нянавісць да тых, хто спрабуе выкарыстоўваць ваенную сітуацыю ў сваіх карыслівых мэтах, як камандзір інтэнданцкай службы. Вайна ў паказе Ю. Бондарава – тэрыторыя палявання смерці, дзе людзі гінуць не толькі ў час атакі, са зброяй у руках, але і нярэдка зусім неспадзявана. Акрамя таго, гэта неверагоднае выпрабаванне фізічных і духоўных сіл. Тут валадарыць выпадковасць, калі нават смелы чалавек на нейкі момант можа праявіць нечаканую слабасць, як стомлены зацяжной абаронай лейтэнант Аўчыннікаў, які пакінуў агнявую пазіцыю. Трагічная нечаканасць напаткала і самога Дзмітрыя Новікава: яму не суджана было дажыць да пераможных майскіх салютаў 1945 г., бо камандаванне перад наступленнем не ведала пра месца яго апошняга знаходжання і Новікаў падчас наступальнай аперацыі асноўных сіл загінуў пад залпамі сваіх жа “кацюш”. На вайне, як вынікае з логікі аповеду, цана любой перамогі, на жаль, аплачваецца чалавечымі жыццямі.

“Жураўліны крык” – аповесць пра суровыя першыя месяцы Вялікай Айчыннай вайны, пра горкі час адступлення Чырвонай арміі восенню 1941 г. Як і ў творах рускіх аўтараў, у В. Быкава знешняя падзейнасць максімальна лакалізаваная, прастора-часавыя межы сціснутыя. У “Жураўліным крыку” няма аднаго цэнтральнага героя, звычайна маладога афіцэра з багатым франтавым вопытам, як у аповесцях Р. Бакланава і Ю. Бондарава. Увага скіравана на невялікую групу байцоў, што па загадзе камбата павінны на суткі перакрыць дарогу фашыстам каля безыменнага чыгуначнага пераезда, каб даць магчымасць батальёну адысці і падрыхтавацца да бою з праціўнікам. Воляй абставінаў апынуліся разам пяцёра чырвонаармейцаў на чале са старшынай Рыгорам Карпенкам – людзі рознага ўзросту, сацыяльнага стану, адукацыйнага ўзроўню, погляду на свет; за выключэннем старшыны – яшчэ і без належнага ваеннага вопыту. Сярод іх васямнаццацігадовы Васіль Глечык, дваццацігадовы Алік Аўсееў і больш сталыя Барыс Фішар, Віцька Свіст, Іван Пшанічны ды Рыгор Карпенка. Усе яны трапілі ў становішча, з якога складана выйсці жывымі. В. Быкаў падрабязна расказвае пра кожнага з байцоў, згадвае іх мінулае, каб акцэнтаваць вытокі характару і паводзін і стварыць калейдаскапічную панараму даваеннай рэчаіснасці (вёска і горад 1920-х гг., нэп, раскулачванне, вайна ў Іспаніі, савецка-фінская вайна) і чалавечых лёсаў.

Вайсковыя ўмовы, у трактоўцы В. Быкава, ставілі чалавека перад маральным выбарам паміж захаваннем уласнага жыцця і выкананнем абавязку, сумленнем і прагматызмам. Яны беспамылкова выяўлялі сутнасць чалавека. Праблема здрадніцтва, важная ў творах пра пачатковы этап вайны, нетрывіяльна раскрываецца на прыкладзе лёсу Івана Пшанічнага, жыццё якога склалася “*няладна і гаротна*” [2, с. 33]. Адпачаткова Пшанічны не быў свядомым ворагам савецкай улады. Ён паходзіў з заможнай сям'і хутаранца, дзе дастатак трымаўся на цяжкай працы. Бацьку раскулачылі і выслалі, а Івану далі зразумець, што кулацкі сын не заслугоўвае даверу, таму Пшанічны, пакрыўджаны на ўвесь свет, абраў за правіла: “*Толькі – сам сабе, сам для сябе, наперакор усім*” [2, с. 38]. На пераездзе нечакана пачутае рэха стральбы паскорыла яго рашэнне здацца немцам, бо Пшанічнаму надакучыла адступаць, “*гібець на сцюжы, галадаць*”, “*капаць-перакопваць зямлю, глухнуць у баях, дзе толькі кроў, раны і смерць*” [2, с. 32]. Ён не верыў у магчымасць байцоў аказаць сур'ёзнае супраціўленне немцам: “*Хіба з імі адужаеш тых, абучаных, узброеных адменнай заграннічнай, як цацка, зброяй, аўтаматамі ды кулямётамі, што страляюць, бы швейныя машынкі шыюць*” [2, с. 33]. Іван спадзяваўся, што фашысты захаваюць яму жыццё, а магчыма, дадуць нейкую пасаду, тады ён адпомсціць за ранейшыя крыўды. Аднак фашысты расстралялі перабежчыка. Гісторыя Пшанічнага падводзіла да высновы, што здрадніцтва на пачатку вайну магло быць вынікам не толькі сацыяльнага паходжання чалавека, але і няправільных адносін грамадства да чалавека.

Яшчэ адзін варыянт здрадніцтва ў аповесці – уцёкі Аліка Аўсеева з баявой пазіцыі. Алік – праг-

матык, што з дзяцінства прызвычаіўся "*развакаць, рэвізаваць, думаць і знаходзіць лепшае для сябе з усёй сумы магчымага*" [2, с. 54]. Ён першым з байцоў зразумеў, што ўсе яны "*смертнікі*" [2, с. 40]. "*Хітраваты, башкавіты баец*" [2, с. 40], з якога ў мірны час мог атрымацца неблагі воін, стаў рабіць захады, каб пакінуць небяспечнае месца. Алік са страхам чакаў першай атакі немцаў, хацеў яе перабыць за спінамі іншых байцоў, але потым яго захапіў бой. Аўсееў нават пашкадаваў, што немцы хутка адступілі, бо нарадзілася надзея на выратаванне і ўзнагароду. Калі ж сітуацыя змянілася на карысць ворага і Аўсееў застаўся толькі з Глечыкам ды параненым Карпенкам, то ён "*таропка сігануў*" [2, с. 99] праз непрытомнага старшыну да лесу. Паводзіны Аўсеева вынікалі з самалюбства, з вырашчанага яшчэ ў дзяцінстве бязмежнага эгаізму.

Сумленна выканалі свой вайсковы абавязак Фішар, Свіст, Карпенка і Глечык. Патомны інтэлігент Барыс Фішар, кандыдат мастацтвазнаўства, спецыяліст па італьянскай скульптуры эпохі Адраджэння, у мірны час не асабліва цікавіўся грамадскім жыццём, палітыкай. Вайна і армія для Фішара былі нечым часовым, а мастацтва – вечным. Паказальна, што ў процівагазнай сумцы байца ляжалі зачарсцвелы кавалак хлеба, стары "Огонёк", патроны і кніга пра Бенвенута Чэліні – таленавітага майстра і поўнага псіхалагічнага антыпода Фішара. Вядома, што Чэліні вызначаўся авантурным характарам. Фішару з яго інтэлігентнасцю, пачуццём чалавечай годнасці "*не падабалася крыклівасць, прыгнятала нязменная патрабавальнасць старшыны, крыклівая злоснасць яго натуры*" [2, с. 68], аднак у дазоры ён адчуў, што "*немудроная старшынова мерка салдацкіх вартасцей*" стала і для яго "*эталонам жыццёвай годнасці*" [2, с. 80], таму, калі ён заўважыў нямецкіх матацыклістаў, свет "*абмежаваўся для яго толькі дакорлівым позіркам злосных старшыновых вачэй і гэтым імклівым ланцужком матацыклістаў*" [2, с. 81]. Фішар імкнуўся паводзіць сябе годна, першым прыняў няроўны бой і загінуў. Смерць "*падслепаватага кніжніка*" [2, с. 33] прымусіла старшыну падумаць пра тое, што "*ёсць яшчэ нейкая невядомая яму сіла, апроч сілы мышцаў і відавочнай рашучасці*" [2, с. 80]: сіла духу.

Пытанне – змагацца з ворагам ці ратаваць сваё жыццё – не стаяла перад Віцькам Свістам. Былы крымінальнік раскаяўся ў грахах маладосці, добраахвотна пайшоў у войска, хоць мог спакойна служыць на рыбфлоце на далёкім Сахаліне. Віцька – адкрыты, кампанейскі, назіральны і бесцырымонны чалавек. Ён лёгка дае саслужыўцам дасціпна-дакладныя мянушкі (Глечык у яго "*салага*", "*салажонак*", Фішар – "*прафесар*", Пшанічны – "*мурло*" і "*скнара*", Аўсееў – "*паніч*" і "*баягуз*"), крадзе сала для ўсіх і рэчы для Глечыка ў Пшанічнага. Свіст любіць рызыку, хоча быць у цэнтры ўвагі. Гэта "*чалавек дзеяння, не ў яго характары было разважаць і думаць нават у спакойны, здатны для гэтага час*" [2, с. 97]. Калі ў час бою варожая тэхніка накіравалася да мастка, Свіст цаной уласнага жыцця спыніў рух танкаў, сам таго не ўсведамляючы, здзейсніў геройскі ўчынак.

Старшына Карпенка на першае месца ў вайсковым жыцці ставіў вайсковую дысцыпліну, выкананне загадаў, а байцоў ацэньваў па іх здатнасці да вайсковай справы. Герой паходзіў са шматдзетнай сялянскай сям'і на Арлоўшчыне, каля дзесяці гадоў праслужыў старшыной роты, па-геройску ваяваў з белафінамі, перад Вялікай Айчыннай працаваў намеснікам дырэктара льнозавода, потым ізноў трапіў у армію. За час адступлення Карпенка шмат зведаў і перажыў, яму даводзілася камандаваць батальёнам, часцей – ротай. У баі ён быў умелым байцом і камандзірам, нядрэнна ведаў псіхалогію салдат: "*З выгляду спакойны і заўжды ўпэўнены ў сваіх учынках, Карпенка на самай справе быў не такі. Але за працяглы час камандзірства ён засвоіў сабе правіла: усё няпэўнае хаваць у сабе, а напаказ выстаўляць толькі скамянелую ўпэўненасць і непахісную цвёрдасць*" [2, с. 39]. Старшына настройваў байцоў на адпор фашыстам, а калі пачуў удалечыні гукі начнога бою, то найперш стаў падбадзёрваць падначаленых. Старшына – прамалінейны, часам прыдзірлівы, не надта адукаваны, але абазнаны ў баявой падрыхтоўцы чалавек, які ў апошнія хвіліны жыцця думае не пра сябе, не пра сям'ю, а пра даручаную яму справу.

Самы малады салдат Васіль Глечык, хлопец з рабочага пасёлка на Беларусі, "*зусім дзіця зялёнае, паслухмяны, але як трэба не абстраляны, баязлівы*" [2, с. 32], па азначэнні Пшанічнага. На пачатку ён аглядваецца на старшыну і таварышаў, хоча выглядаць сапраўдным байцом у іх вачах. "*Ціхманы, пакорлівы Глечык*" [2, с. 41] не спалохаўся ў час бою, а потым, калі ўбачыў у бронетранспарцёры "*звычайны, хударлявы, парадкам нявголены*" [2, с. 89] твар мёртвага немца, то ў яго канчаткова знік страх перад чужынцамі. Кволы з выгляду Глечык аказаўся маральна больш сталым за Пшанічнага і духоўна мацнейшым за спешчанага Аўсеева. Чатыры месяцы знаходжання ў войску прывялі хлопца да высновы, што вайна – гэта "*самае праклятае з усіх ліхаў, заведзеных жыццём на зямлі*" [2, с. 103], з якім трэба змагацца. Уцёкі Аўсеева сутыкнулі ў душы хлопца процілеглыя пачуцці: "*прагнасць паратунку, пакуль была на тое магчымасць, і свежая яшчэ, толькі што пазнаная і гордая*

*рашучасць стрываць*" [2, с. 99]. Апошняя з іх перамагла. Учынак Аўсеева Глечык успрыняў як здраду і застрэліў палахліўца. Перажытае за кароткі час на пераездзе істотна змяніла шкалу каштоўнасцей Глечыка, ранейшыя крыўды на маці, айчыма, нячуласць таварышаў, сцюжа, голад, страх смерці падаліся яму мізэрнымі. Хлопцу вельмі хацелася жыць "*у сцюжы, голадзе, страху, хоць у такім жудасным пекле, якім была вайна*" [2, с. 102]. Ад убачанага ў небе ланцужка жураvoў "*у спапялелую ад гора душу байца дыхнула замілаванай шчаслівай мінуўшчынай яго дзяцінства*" [2, с. 102]. Крык падбітага жаўрука, што імкнуўся, але не мог дагнаць сваю чародку, растрывожыў душу хлопца, бо нагадваў яго самога. Глечык да канца пераадолеў страх смерці, з гранатай у руцэ баец чакаў нямецкія танкі: "*Ён разумеў, што гэта канец, і з усяе сілы зацяў у сабе нясцерпную журботу душы, у якой вялікай прагай да жыцця ўсё біўся прызыўны жураўліны крык...*" [2, с. 103]. Фінал твора – аптымістычна-трагедыйны: пераадолены страх смерці – перамога над сабой, перамога ў імя Перамогі.

Кампазіцыя ўсіх трох аповесцей канцэптуальна выверaная. Варта адзначыць майстэрскае выкарыстанне пісьменнікамі іншасказальнага вобраза сонца. Падзеі ва ўсіх творах пачынаюцца ноччу ці вечарам, а заканчваюцца апоўдні. Сонца ў Ю. Бондарава – увасабленне перамогі, у Р. Бакланава – амбівалентны вобраз (небяспекі і перамогі адначасова), у В. Быкава – сімвал надзеі, паказчык недасягальнасці мары застацца жывымі. У "Пядзі зямлі" лірычная плынь арганічна спалучаецца з эпічнай, падзеі і персанажы характарызуюцца галоўным героем і характарызуюць яго, у "Апошніх залпах" і "Жураўліным крыку" дамінуе эпічная плынь і аповед ад трэцяй асобы. Пры гэтым у Ю. Бондарава падзейная канва акцэнтуе імклівасць сітуацыі на фронце і складанасць чалавечых узаемадачыненняў, у В. Быкава – даследуецца роля абставін у лёсе чалавека на вайне.

Дарэчы, у "Жураўліным крыку" ўпершыню выявілася такая рыса прозы В. Быкава, як здольнасць выбраць сітуацыю, дзе характары персанажаў выяўляюцца "з рэзкасцю аптычнага фокуса" [3, с. 167]. "Жураўліны крык" вызначаецца ўмелым выкарыстаннем празаікам сюжэтна і псіхалагічна значных дэталей. Так, доўгае адступленне байцоў і камбата пісьменнік падкрэслівае праз змястоўныя штрыхі: "*Захінуўшыся ад ветру каўнярамі **зашмальцаваных, аблепленых глінай шынялёў**, шасцёра іх стаяла купкай ля зламанага дышля шлагбаума*" [2, с. 20]; "***сіпатым праступджаным голасам** казаў капітан, высокі кастлявы чалавек **з зашчаціненым, змораным** тварам*" [2, с. 20]. Пра панесеныя раней страты перакаnальна сведчыў выгляд батальёна, "***кароценькая, зусім не батальённая калона** якога, мерна пагойдваючыся ў вячэрняй імгле, хутка аддалялася к лесу*" [2, с. 21]. Сэнсава значную ролю адыгрываюць у творы і апісанні прыроды, якая адцяняе чалавечыя пачуцці: трывогу байцам навявалі вецер ды шызыя змрочныя восеньскія хмары, а рэдкае сонца на змярканні і раніцай успрымалася зманлівым абяцаннем паратунку.

Адразу пасля выхаду "Жураўлінага крыку" некаторыя крытыкі папракалі пісьменніка ў непрадуманасці кампазіцыі, у жаданні адразу расказаць пра кожнага з герояў твора замест таго, каб паказаць іх "праз асобныя дэталі" [4, с. 180], хоць у творы ад самага пачатку аповеду лаканічна, але трапна рэпрэзентуецца кожны з персанажаў, як, напрыклад, у час развітання з камбатам ці пры падрыхтоўцы байцамі акопаў: "*Пшанічны ледзь не па самыя плечы ўкапаўся ў рудую кучу гліны; далёка навокал адкідваючы рассыпістыя камякі, зухавата і весела асталёўваўся разгарачаны Свіст*" [2, с. 23]; менш старанна побач з ім працаваў Аўсееў, "*спрактыкавана ладзіў кулямётную пазіцыю старшына Карпенка; на другі бок ад яго старанна дзёўб зямлю расчырванелы, потны Глечык*" [2, с. 23].

Прасякнутыя гуманістычным пафасам аповесці Рыгора Бакланава, Юрыя Бондарава, Васіля Быкава фарміравалі ўяўленне пра вайну як найвялікшае фізічнае і маральнае выпрабаванне, што выпала на долю савецкага народа ў 1941–1945 гг., пра гераізм людзей з перадавой як пастаяннае пераадоленне ў іх свядомасці "сумненняў, няўпэўненасці, страху" [3, с. 63] у суровых франтавых умовах. Творы трох пісьменнікаў збліжае асэнсаванне магчымасцей чалавечага духу, паказ драматызму праверкі на чалавечнасць праз хрышчэнне агнём, залежнасці лёсу чалавека на вайне ад сітуацыі. "Жураўліны крык" Васіля Быкава ў кантэксце аповесцей Рыгора Бакланава і Юрыя Бондарава адрозніваецца даследаваннем паводзін чалавека менавіта ў памежнай сітуацыі, акцэнтаваннем псіхалагічнай складанасці працэсаў маральнага выбару на парозе жыцця і смерці, канцэптуальным праблемна-тэматычна і сюжэтна аргументаваным экскурсам у мінулае персанажаў, максімальнай завостранасцю канфлікту.

**Спіс літаратуры**

1. **Быкаў, В.** Поўны збор твораў : у 14 т. / В. Быкаў. – Мінск, 2014. – Т. 10, кн. 1. – 544 с.

2. **Быкаў, В.** Збор твораў : у 4 т. / В. Быкаў. – Мінск : Маст. літ., 1980–1982. – Т. 1. – 1980. – 432 с.

3. **Бондарев, Ю. В.** Собрание сочинений : в 6 т. / Ю. В. Бондарев. – М. : Худож. лит., 1983–1986. – Т. 6. – 1986. – 415 с.

4. **Кудраўцаў, І.** Творчыя завaёвы і страты / І. Кудраўцаў // Полымя. – 1960. – № 7. – С. 177–180.